На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 11 (133)

Аўторак, 21 студзеня 1997 г.

Выдаецца
на беларускай і рускай мовах

Кошт: у кіёсках і крамах — 1500 руб. у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

21 студзеня
Узыход Сонца 8.44
Заход Сонца 16.38
Даўжыня дня 7.54
Першая чвэрць Месяца 15 студзеня

Карамзин предупреждает: и Россия любить умеет!

Людмила Маслюкова,
политический обозреватель "Народной воли"

Январское послание Ельцина об ускорении интеграции официальная Беларусь постаралась подать как ответ на прошлогоднее декабрьское обращение Лукашенко к Борису Николаевичу. Минск, видимо, желает оставаться инициатором воссоединения двух государств. Эту стратегию местные аналитики устойчиво связывают с кремлевскими амбициями президента. За пределами республики такие прогнозы оцениваются как шутка. Но в каждой шутке, как известно, есть доля правды.

В память народов о российских выборах лета 1996 года навсегда врезался стремительный Александр Лебедь. Очень примечателен его блистательный пролет из Приднестровья в Кремль. Он ведь тоже работал на электорате, отдающемся харизматическому лидеру, который нравится, впечатляет, покоряет. Он тоже был дорог простым людям, которые за порядок и справедливость, за все хорошее — в общем и целом это люди скорее смутно-левых взглядов. Во втором туре эти "левые" симпатии от Лебедя перешли главным образом Ельцину, но отнюдь не коммунисту Зюганову. Успех у избирателей бравый генерал выгодно разменял на высокую должность, с которой, правда, быстро слетел.

Спрашивается, сколько же обиженных, разочарованных, ностальгирующих российских избирателей мог бы увлечь за собой Александр Лукашенко? При том, что в Беларуси, созидающей социально ориентированный рынок, он пользуется поддержкой процентов 70 взрослых граждан? Пользуется лихо, всеми правдами и неправдами, абсолютно ничем не стесняясь. Он на каждом шагу похваляется всенародной к нему любовью, на что имеет немалые основания — реально, без вранья, процентов на 40.

Весьма соблазнительно вывести такую фигуру на широкие российские политические подмостки. Уж этот бы коммунистов переиграл, рьяных патриотов завоевал, обнищавших обаял, средний бизнес облапошил. И, как Лебедь, мог бы тоже променять своих избирателей на пост, скажем, вице-президента Российской Федерации. Ну, а там и с ним можно, по традиции, как с Александром первым...

Но тут-то и всплывает предостережение писателя и историка Николая Михайловича Карамзина — и крестьянка любить умеет! В его республике Александру Григорьевичу привержена всей душой прежде всего именно крестьянка, деревня, провинция. А разве не та же славянская душа у россиянки? Ведь ежели она полюбит лихого молодого усатого белоруса — разве ей втолкуешь, что краше рыжий реформатор Чубайс?

В период очередного скоротечного интеграционного всплеска о Лукашенко опять поспешили высказаться одобрительно и спикер Госдумы Геннадий Селезнев, и руководитель Совета Федерации Егор Строев. Такое мнение неоднократно выражал и глава российского правительства Виктор Черномырдин. Московские вояжеры в Минске публично заявляли, что ни один серьезный политик не станет возражать против славянского интегратора. Осмелившийся критиковать рискует подвергнуться обструкции со стороны общественного мнения. Все видели, как думские фракции встречали белорусского президента стоя, овациями. Кто же, будучи в здравом уме, возьмется отрицать, что есть у него влияние в тех верхах? А если сюда добавить такое мощнейшее орудие воздействия на умы, как российские телеканалы? Региональное телевидение? Сонмища пишущей братии? Да развернуть во всю ширь по эфирам и газетным полосам в исполнении Александра Григорьевича "программу русского сентиментализма"? Эту программу в свое время исповедовал Карамзин и с неотразимой художественной силой в повести "Бедная Лиза" на примере главной героини доказал: такая в пруду утопится, но не разлюбит избранника.

Белорусский президент научился прекрасно обращаться с монополизированными СМИ, особенно электронными. Дайте ему их — и он перевернет матушку-Россию. Ему не дадут? А он отнимет — действуя нахраписто, через головы умников, обращаясь к массам напрямую. Сибирская низменность не устоит перед его неподражаемым популистским даром. Дальний Восток увидит, как идет к намеченной цели наш всенародный и единственный — напролом, как ночью по тайге. Питер услышит звон тяжелых бокалов у пивнушек под тост "За Саньку!" Физики из Дубны придут в восхищение, когда он с ними проникновенно побеседует о расщеплении ядра — неотразимым жестом прикладывая правую руку к левой стороне груди. К каждому социальному слою знает Александр Григорьевич заветное словцо — и никогда не перепутает: не обратится к доярке, как к кэгэбисту.

Сегодня все это фантазии? Пожалуй, но они вполне научные, потому что базируются на конкретном опыте, изученном и обобщенном белорусской политологией и социологией.

Вероятность прорыва Александра Лукашенко на кремлевский трон существует. Когда это может случиться? Как только, так сразу...

Посол России в Беларуси Валерий Лощинин, комментируя злободневную тему ельцинского послания, подчеркивал, что не надо впадать в истерику: никто не говорит, что референдум в двух странах будет чуть ли не завтра, а объединение государств — послезавтра; разве что много позже — может, к двухтысячному году. Правильно, по Конституции где-то там и маячат новые выборы президента Российской Федерации. К тому же Лукашенко, манипулируя гласом народным, запросто переписывает под себя любые конституции. Почему бы ему не выйти с такой же инициативой к будущей единой стране? И все может свершиться быстро, если учитывать бестемпературное отягощение легких Бориса Николаевича, заторможенность мимики, движений и речи. И Госдума уже запустила "пробный шар" отстранения Ельцина от власти по состоянию здоровья. Над пространствами государства российского витает призрак близких выборов президента.

Небезынтересно и то, как оценили "интеграционный январь" 1997 года вышеупомянутые персоны Г.А.Зюганов и А.И.Лебедь. Геннадий Андреевич сказал, что это политиканство. Ему ли не угадать знакомый трюк, однажды и против него эффективно примененный? Александр Иванович так и врезал: это, мол, политический трюк. Ему ли это не знать — исполнителю прошлогоднего кульбита? Всей только и разницы, что теперь ставят на птицу более высокого полета. Негативная реакция на событие этих двух, претендующих на президентство в России, подтверждает правомерность беглых "фантастических" размышлений на "шуточную" тему.

Беларусь – Украіна

Сустрэліся прэзідэнты...

17 студзеня ў Гомелі адбылася рабочая сустрэча прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі і прэзідэнта Украіны Л.Д.Кучмы.

Бакі канстатавалі, што гістарычныя, эканамічныя і культурныя сувязі паміж дзвюма краінамі складаюць надзейную аснову для далейшага развіцця супрацоўніцтва на прынцыпах суверэннай роўнасці, неўмяшання ва ўнутраныя справы адзін аднаго, у духу партнёрства і ўзаемнага даверу.

Было адзначана імкненне абедзвюх дзяржаў да ўмацавання двухбаковых адносін, вызначаны канкрэтныя напрамкі іх развіцця з улікам нацыянальных інтарэсаў Беларусі і Украіны.

Акцэнтуючы ўвагу на прыярытэтнасці гандлёва-эканамічных сувязей паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай, бакі пацвердзілі ўзаемнае разуменне неабходнасці ліквідацыі бар'ераў і абмежаванняў ва ўзаемным гандлі, садзейнічання заключэнню прамых дагавораў паміж рэгіёнамі і суб'ектамі гаспадарчай дзейнасці дзвюх краін.

Прэзідэнты адзначылі важнасць развіцця супрацоўніцтва ў сферы вытворчай кааперацыі, стымулявання рэалізацыі сумесных інвестыцыйных праектаў, падкрэслілі неабходнасць дзейснага кантролю за выкананнем дасягнутых дамоўленасцей.

Бакі абмеркавалі ход работ па дэлімітацыі дзяржаўнай граніцы паміж дзвюма краінамі, адзначыўшы пры гэтым, што іх вынікам павінна стаць падпісанне ў бліжэйшы час Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай аб дзяржаўнай граніцы.

Было падкрэслена асабліва значэнне для абедзвюх дзяржаў мінімізацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Бакі пацвердзілі ўзаемнае імкненне да супрацоўніцтва ў гэтым напрамку.

Прэс-служба прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Віншуем!

Савет міністраў сфарміраваны

У адным з апошніх нумароў мы надрукавалі прозвішчы шэрагу асоб, якія ўказам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь назначаны на розныя ўрадавыя пасады. На сённяшні дзень Савет міністраў сфарміраваны поўнасцю. Вось яго канчатковы склад:

ЛІНГ Сяргей Сцяпанавіч — выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь
ПРАКАПОВІЧ Пётр Пятровіч — першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь
ГАРКУН Уладзімір Гіляравіч — намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь
ДАЛГАЛЁЎ Васіль Барысавіч — намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь
КОКАРАЎ Валерый Іванавіч — намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь
РУСАКЕВІЧ Уладзімір Васільевіч — намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь
МЯСНІКОВІЧ Міхаіл Уладзіміравіч — кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
ДАМАШКЕВІЧ Мікалай Фёдаравіч — старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь
НАВІЦКІ Генадзь Васільевіч — міністр архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь
МАРЫНІЧ Міхаіл Афанасьевіч — міністр знешніх эканамічных сувязей Рэспублікі Беларусь
АГАЛЕЦ Валянцін Сцяпанавіч — міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь
БАТУРА Барыс Васільевіч — міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь
АНТАНОВІЧ Іван Іванавіч — міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь
САСНОЎСКІ Аляксандр Уладзіміравіч — міністр культуры Рэспублікі Беларусь
ЗОРЫН Валянцін Паўлавіч — міністр лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь
ЧУМАКОЎ Аляксандр Пятровіч — міністр абароны Рэспублікі Беларусь
СТРАЖАЎ Васіль Іванавіч — міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь
БАМБІЗА Іван Міхайлавіч — міністр па справах Садружнасці Незалежных Дзяржаў Рэспублікі Беларусь
САЗОНАЎ Аляксандр Юр'евіч — міністр прадпрымальніцтва і інвестыцый Рэспублікі Беларусь
НОВАК Васіль Аляксандравіч — міністр па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі Рэспублікі Беларусь
КЕНІК Іван Альбінавіч — міністр па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь
РУСЫ Міхаіл Іванавіч — міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь
ХАРЛАП Анатоль Дзмітрыевіч — міністр прамысловасці Рэспублікі Беларусь
ГАНЧАРЭНКА Уладзімір Іванавіч — міністр сувязі Рэспублікі Беларусь
ЛЯВОНАЎ Васіль Севасцьянавіч — міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь
ДАРГЕЛЬ Вольга Бараніславаўна — міністр сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь
МАКЕЙЧЫК Уладзімір Іосіфавіч — міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь
НІЧЫПАРОВІЧ Уладзімір Мікалаевіч — міністр статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь
ГЕРАСІМАЎ Валянцін Васільевіч — міністр паліва і энергетыкі Рэспублікі Беларусь
КАЗЛОЎ Пётр Афанасьевіч — міністр гандлю Рэспублікі Беларусь
ЛЯХ Іван Аляксеевіч — міністр працы Рэспублікі Беларусь
ШЫМАЎ Уладзімір Мікалаевіч — міністр эканомікі Рэспублікі Беларусь
МАЦКЕВІЧ Уладзімір Аляксандравіч — старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь
БЕЛЬСКІ Уладзімір Пятровіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку
ФЁДАРАЎ Рыгор Канстанцінавіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта па авіяцыі Рэспублікі Беларусь
ПАЗНЯК Аляксандр Рыгоравіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта па справах моладзі Рэспублікі Беларусь
КРЭЧКА Пётр Васільевіч — старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь
ДЗЯМЧУК Мікалай Мікалаевіч — старшыня Дзяржаўнага падатковага камітэта Рэспублікі Беларусь
ПАЎЛОЎСКІ Аляксандр Аляксеевіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў Рэспублікі Беларусь
КУЗНЯЦОЎ Георгій Іванавіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі Рэспублікі Беларусь
ДУБОВІК Леў Антонавіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта па энергазберажэнню і энергетычнаму нагляду Рэспублікі Беларусь
МІХАЛЬЧАНКА Аляксандр Мікалаевіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь
КУДАШОЎ Валерый Іванавіч — старшыня Дзяржаўнага патэнтнага камітэта Рэспублікі Беларусь
КАРАШКОЎ Валерый Мікалаевіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі Рэспублікі Беларусь
ПАКУМЕЙКА Юрый Міхайлавіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта па гідраметэаралогіі Рэспублікі Беларусь
ДАСТАНКА Анатоль Паўлавіч — старшыня Дзяржаўнага вышэйшага атэстацыйнага камітэта Рэспублікі Беларусь
ГАЙСЁНАК Віктар Анатольевіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь
БІЛЫК Аляксандр Мікалаевіч — старшыня Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь

СТАРЫЕ ПЕСНИ О ГЛАВНОМ

Как мы и обещали, продолжаем сочинять куплеты на мотивы известных песен, посвященные лицам, так или иначе проявившим себя на минувшей неделе.

А итоги минувших семи дней не укладываются в строку того или иного президентского указа. Они — в тенденции. Продолжала работу Палата представителей во главе с бывшим первым секретарем ЦК КПБ Анатолием Малофеевым. В ходе обсуждения бюджета особой аргументированностью отличались выступления бывшего второго секретаря ЦК КПБ Алексея Камая. Бюджет от имени правительства представлял парламенту бывший секретарь ЦК КПБ Сергей Линг. Государственным советником назначен бывший секретарь ЦК КПБ Николай Дементей. Министром иностранных дел стал бывший завотделом ЦК КПБ, а позже член политбюро ЦК КП Российской Федерации Иван Антонович.

Как дела? Все по-старому, все при старых... Какая жизнь, такие и песни. Споем...

Старый Новый год

Музыка Р.Паулса
Стихи А.Вознесенского
Аранжировка А.Лукавого

С первого по тринадцатое каждого января
Сами собой вспоминаются старые имена.
Стабилизации признаки: нам обещают рай
Светлого завтра призраки — Линг, Малофеев, Камай.


Словно тринадцать месяцев нынче у нас в году,
Словно будильник взбесился: "Лучше назад пойду!"
Словно машина времени нас возвращает вспять.
Как топором по темени — эдаких возвращать?!

С первого по тринадцатое каждого января
Сами собой набираются старые номера.
Нету в блокнотах записей, но наберет рука,
Словно по старой памяти, вдруг телефон ЦК.

Я закопал шампанское под снегопад в саду.
Выйду во двор с опаскою: вдруг его не найду.
Старое возвращается, новое крепко спит.
Очереди учащаются, мясо уже дефицит.

С первого по тринадцатое зря новостей не жди.
С первого по тринадцатое вновь к нам придут вожди.
Ленинская картавинка, сталинский злой прищур.
Новому впору каяться — будет не чересчур.

Все перемены кончатся, стрелки пойдут назад.
Нас не страшит пророчество культа, дождей наград.
Прошлое давит молодость, старости звездный миг...
Что ж вам так власти хочется — Камай, Малофеев, Линг?









* * *

Подводя итоги минувшей недели, нам и в самом деле пальму первенства хотелось оставить за бывшими партайгеноссе Анатолием Малофеевым, Алексеем Камаем, Сергеем Лингом, Николаем Дементеем, Иваном Антоновичем. Но... Громом средь зимы пронеслось известие об аресте главного банкира страны Тамары Винниковой, недавно вернувшейся из отпуска и за два дня до трагической отставки убеждавшей лукашенковский электорат в телевизионной программе "Рэзананс" о необходимости верности избранному президентом курсу. Тамара Дмитриевна уже не на свободе. А мы, мы-то, разве мы с вами — на свободе? Впрочем, вспомним мотив известной песенки и споем на новые слова.



ЗАРАЗА

Музыка и стихи А.Цекало
Аранжировка А.Лукавого.
(Исполняется шепотом)

Ночь на дворе,
Пес в конуре,
Бедную даму аре...:*
"Зря не ори!
Все говори!
Где наши деньги? Не ври!"
Теперь сидит в "конторе",
*В подвале на Скори**...*
И Главконтрольщик Коля
Ей тихо говорит,
Ей тихо говорит:
"Ты обобрала нас два раза,
Это знает целый мир.
Ты обычная зараза,
А не главный наш банкир!"
Так вот всегда:
Грянет беда,
И не спастись, господа!
С каждым вот так,
Если дурак
*Впрок не уходит в отставк***...*
Его возьмут нежданно,
*Пошлют на Волода****...*
И там любой немедленно
Признается, что "Да!"
Признается, что "Да!
Да, я во всем готов признаться,
Только разрешите жить!"
Вот что значит — покоряться
И как следует служить!

Примечание:

*** ...стовали**
****...ны**
*****...у**
******...рского (известный в Минске следственный изолятор).**

Дипновости

Ивана Титенкова "определили" в дипломаты. Урал Латыпов на такой уровень "не потянул"

У кого больше прав называть себя дипломатом - у Ивана Титенкова или Урала Латыпова? Сама постановка такого вопроса выглядит абсурдной минимум по двум причинам. Во-первых, Иван Иванович, хотя и президентский, но все же завхоз. А Урал Рамдракович не просто первый помощник президента, он еще и курирует международные вопросы. Во-вторых, всего каких-то пяток дней тому назад сам Александр Григорьевич рассказывал журналистам, что нового министра иностранных дел он выбирал из трех претендентов: Ивана Антоновича, Владимира Сенько и Урала Латыпова. Повезло, как всегда, Ивану Ивановичу. Владимира Леоновича одарили "хлебным местом" на Западе, а Урал Рамдракович остался, как говорится, при своих интересах.

Впрочем, интересы своего первого помощника президент все же ущемил. И сделал это своим указом за номером 33. Этот документ определяет порядок получения новых дипломатических паспортов, поскольку с 1 февраля старые становятся недействительными. Удивительно, но помощники президента в список лиц, которым положены зеленые паспорта, не попали. Зато в них есть и управделами президента, и госсекретарь, и даже глава Национальной телерадиокомпании.

Обманулись в своих ожиданиях и депутаты Национального собрания. Не секрет, что в момент противостояния Верховного Совета и президента кое-кто из депутатов предпочел получить обещанные блага, в том числе и диппаспорта. А некоторые, например, сопровождавшие Лукашенко в недавней поездке в Португалию Иван Пашкевич и Сергей Костян даже успели их получить. Теперь им остается сохранить свои диппаспорта в качестве сувениров, а то и вовсе вернуть их в МИД, поскольку по новому указу теперь имеют право получить паспорта только руководители обеих палат и их заместители.

Впрочем, всемогущий Александр Григорьевич может им помочь. И не только им. Ибо заветный список кончается такой строчкой - "другим лицам по решению президента Республики Беларусь".

Рокировка "по-мидовски"?

Из Министерства иностранных дел Беларуси в Госдепартамент США ушла нота, в которой сообщается, что в скором будущем дипломатические интересы Республики Беларусь в Соединенных Штатах Америки будет представлять Валерий Цепкало. В случае получения соответствующего агремана нынешний первый заместитель главы министра иностранных дел отправится в Вашингтон, где заменит на должности Чрезвычайного и Полномочного Посла Сергея Мартынова.

Предполагается, что по возвращении на Родину г-н Мартынов сменит г-на Цепкало на его нынешней должности. Таким образом, предстоит рокировка "по-мидовски".

Владимир ГЛОД.

Слышали?

В Парламентской ассамблее ОБСЕ Беларусь будет представлять Верховный Совет 13-го созыва

Такое решение было принято вечером 17 января в Вене, где в этот день проходило заседание Постоянного комитета Парламентской ассамблеи Организации по безопасности и сотрудничеству в Европе. Членам комитета предстояло сделать выбор, поскольку на место в Ассамблее претендовали сразу две организации: Верховный Совет Беларуси 13-го созыва и Палата представителей Национального собрания. Их интересы в Вене представляли делегации во главе, соответственно, с Петром Кравченко и Владимиром Коноплевым.

Голосованию предшествовала глубокая и кропотливая работа специального комитета, который был создан по указанию главы Парламентской ассамблеи ОБСЕ для проверки полномочий прибывших в столицу Австрии делегаций. Заслушав доклад главы специального комитета М.Джоплина (Великобритания), члены Постоянного комитета вначале единогласно приняли решение сохранить за делегацией Верховного Совета Беларуси 13-го созыва полномочия представлять Республику Беларусь в Парламентской ассамблее ОБСЕ. Однако затем в результаты голосования были внесены изменения. Представитель Российской Федерации господин Зорин попросил "отложить этот вопрос, чтобы не обострять ситуацию в Республике Беларусь, и направить экспертов ОБСЕ в Минск для более глубокого изучения ситуации". Это мнение было учтено Постоянным комитетом, однако не изменило принятого ранее решения. Руководитель делегации Верховного Совета Петр Кравченко был приглашен занять место за столом для официального представителя парламента Беларуси. Сразу же на столе была установлена табличка — Беларусь. Временно действующие гостевые карточки членов делегации Верховного Совета Петра Кравченко и Владимира Нистюка были заменены на постоянные.

Альтернативной делегации во главе с Владимиром Коноплевым было предложено покинуть зал заседаний.

Владимир ГЛОД.

Лідэры "Грамады" выязджаюць у правінцыю

Кіраўнік Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі "Народная грамада" Мікалай Статкевіч і старшыня кантрольна-рэвізійнай камісіі партыі Георгій Таразевіч на днях пабывалі ў Гродне.

У каардынацыйным штабе БСДГ нам паведамілі, што рэгіянальны філіял партыі запрасіў іх на чарговую гарадскую канферэнцыю, мэтай якой стала вырашэнне пытанняў фарміравання новых органаў свайго прадстаўніцтва ў правінцыі, а таксама праблемы выхаду "Народнай грамады" на шырокую палітычную арэну. Між іншым, гродзенская арганізацыя па колькасці прыхільнікаў БСДГ стаіць на другім месцы пасля мінскай.

Марына РАССАФОНАВА.

Духоўны скарб

76. Што рабілі беларусы ў Маскве ў XVII стагоддзі?

Уплыў беларусаў на духоўную і матэрыяльную культуру Масковшчыны быў адчувальны ужо з часоў Сярэднявечча. У XVII стагоддзі ён стаў вызначальным і абымаў літаральна ўсе сферы жыцця.

Перасяленні беларусаў на Масковшчыну ў XVII стагоддзі адбываліся з розных прычынаў: у 30—40-х гадах шмат нашых суайчыннікаў змушаныя былі выехаць туды ў выніку наступу паланізацыі, а пад час вайны 1654—1667 гадоў іх у вялікай колькасці (блізу 300 тысяч) забралі ў палон.

Беларусы жылі ў Маскве ў розных месцах. У 1672 годзе яны засялілі гэтак званую Мяшчанскую (Новамяшчанскую) слабаду. Да прыкладу, у 1685 годзе тут жыло 612 сем'яў, што выехалі з розных куткоў Беларусі. Шмат беларусаў жыло па-за межамі Мяшчанскай слабады. Так, у Новадзявочым манастыры знаходзілася блізу 300 беларускіх манашак, што перасяліліся сюды з Куцеінскага манастыра. Наогул, паводле падліку вучоных, у другой палове XVII стагоддзя беларусы складалі каля 20% насельніцтва Масквы.

Надзвычай важкім быў уклад беларусаў у развіццё маскоўскага дойлідства, яскравым пацвярджэннем чаго з'яўляюцца пабудаваны нашымі продкамі шэдэўр архітэктуры — Каломенскі палац.

Менавіта беларусы прынеслі ў Маскву аб'ёмную ажурную, высокарэльефную разьбу. Разная драўляная паверхня, выкананая ў стылі барока, пакрывалася суцэльным золатам па спецыяльным грунце і старанна паліравалася. Сярод унікальных твораў беларускай разьбы ў Маскве можна назваць іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра — помнік культуры сусветнага значэння. Кіраваў гэтымі работамі Клім Міхайлаў, Герасім Акулаў, Восіп Андрэеў, Андрэй Фёдараў, Якаў Сяменаў.

Прыкметную ролю ў развіцці рамяства ў Маскве адыгралі беларускія кафляры, якія прынеслі сюды сакрэт вырабу рэльефнай шматколернай кафлі. Найбольш славутымі кафлярамі былі вучні беларускага майстра Пятра Заборскага з Вільні — выхадзец з Копысі Ігнат Максімаў і мсціславец Сцяпан Іванаў. Гэтыя майстры разам зрабілі кафляныя фрызы Сабора Рыгора Неакесарыйскага ў Маскве, а потым паліхромную кафлю для фасадаў Пакроўскага сабора ў Ізмайлаве. Сцяпан Іванаў (па мянушцы Палубес) стварыў унікальныя маёлікавыя рэльефы Апосталаў для барабана царквы Успення ў Ганчарах (1691 год). Зараз некаторыя яго творы можна пабачыць у музеі народнага мастацтва ў Каломенскім.

Беларускія майстры працавалі ў традыцыях гарматнай справы, закладзенае яшчэ Андрэем Чохавым (Чухавым), таксама беларусам з паходжання, які ў 1586 годзе адліў славутую "Цар-гармату". У Маскве ў XVII стагоддзі асабліва ценіліся беларускія зброеўнікі, якія выраблялі халодную і агнястрэльную зброю; яны працавалі ў складзе Збраёвай (Аружэйнай) палаты.

Сярод беларусаў-ювеліраў вылучаліся спецыялісты па апрацоўцы срэбра, якія выраблялі разнастайны багата аздоблены посуд і царкоўнае начынне.

Менавіта дзякуючы нашым таленавітым продкам высокага ўзроўню ў Маскве дасягнула майстэрства апрацоўкі косці. Асабліва ўзгадваецца ў гэтай галіне вылучаліся выхадцы з Віцебшчыны, якія выраблялі шахматныя фігуркі са слановай косці, а таксама шахматныя дошкі і століцы.

Стваральная праца беларусаў у Маскве ў XVII стагоддзі не абмяжоўвалася толькі сферай матэрыяльнай культуры. Вельмі плённым было ўздзеянне нашых продкаў на духоўнае жыццё Масквы. Дастаткова прыгадаць імя Епіфана Славінецкага, які быў адной з ключавых асоб у часе вядомых царкоўных рэформаў Нікана. Ён пераклаў і выдаў шматлікія творы айцоў царквы, склаў грэцка-славянска-рускі лексікон. Дзякуючы ягонаму перакладу твора заснавальніка навуковай анатоміі А.Везалія "Па будову чалавечага цела" маскоўскія медыкі далучыліся да найвышэйшых дасягненняў навукі Заходняй Еўропы.

Выключнае месца ў маскоўскай культуры заняў Сымон Полацкі — вядомы асветнік, таленавіты паэт, непаўторны драматург, унікальны багаслоў, тонкі перакладчык і выдатны педагог. Яму належыць гонар укладальніка і аўтара першага Статута Маскоўскай акадэміі. Пад яго кіраўніцтвам доўгі час дзейнічала маскоўская друкарня. Ён жа, дарэчы, быў і настаўнікам царскіх дзяцей.

Акрамя таго, беларусы заклалі асновы расейскага тэатра. Яны былі акторамі тэатральнай трупы пры двары Аляксея Міхайлавіча. Шмат беларусаў было і сярод царкоўных спевакоў і вайсковых музыкаў; яны зрабілі вялікі ўклад у развіццё расейскага музычнага мастацтва.

Алег ТРУСАЎ, кандыдат гістарычных навук.

77. Хто стварыў літары, якімі мы сёння карыстаемся?

Беларусы карысталіся і карыстаюцца двума алфавітамі — кірыліцай і лацінкай. Акрамя таго, беларускія татары, што жывуць на гэтай зямлі ўжо 600 гадоў, свае кнігі пісалі па-беларуску арабскімі літарамі.

Асабліва вялікі ўклад зрабілі беларусы ў развіццё кірыліцы. Гэтую азбуку, створаную ў 863 годзе хрысціянскімі прапаведнікамі Кірылам і Мяфодзем для тагачаснай мовы паўднёвых славянаў, удасканалілі і спрасцілі беларускія перапісчыкі. Яны адкінулі лішнія і ўзялі новыя літары, якіх не было ў пачатковай кірыліцы: э, й, а таксама адмысловую літару ґ (ганак, мазгі).

Францішак Скарына стварыў прыгожы друкарскі шрыфт, а канчаткова наблізіў формы літар да сучасных Ілля Капіевіч (родам з Амсціслава), выпускнік Слуцкае гімназіі, кнігавыдавец і перакладчык. У 1700 годзе ў Амстэрдаме ён заснаваў друкарню і стварыў акругленыя, падобныя да лацінскіх, літары кірыліцы для тытульных друкаваных кніг. Шрыфты Капіевіча ўпадабаў расейскі цар Пётр I, які гады быў у Нідэрландах, і замовіў майстру літары для кніг.

Новы шрыфт на аснове Капіевічавых літараў Пётр I зацвердзіў у 1708 годзе. Так адбылася рэформа расейскай азбукі — уведзена *гражданскіх*, гэта значыць свецкіх, літараў. Новыя літары яшчэ доўга звалі "амстэрдамскіе литеры" ці "беларускія азбука". Менавіта гэтымі літарамі цяпер карыстаюцца беларусы, расейцы, украінцы, македонцы, баўгары, сербы ды іншыя народы, што ўжываюць кірыліцу. Мовазнавец Ян Станкевіч назваў гэтыя літары *капіеўкаю*.

Вінцук ВЯЧОРКА.

Спорт-каляндар

Ёсць дзе паказаць, было б што паказаць

Новы спартыўны год багаты на цікавыя спаборніцтвы. Напрыклад, для прадстаўнікоў зімовых відаў спорту, якія рыхтуюцца да Алімпіяды-98 ў Японіі, сур'ёзным экзаменам будзе чэмпіянат свету па біятлону ў Славакіі. Тут у пачатку лютага стартуюць і нашы страляючыя лыжнікі, чый патэнцыял у міжнародным аўтарытэце даволі высокі. Да маючых адбыцца спаборніцтваў рыхтуюцца ўладальніца сярэбранай узнагароды алімпійскіх гульняў у Ліллехамеры Святлана Парамыгіна, Алег Рыжанкоў, Аляксандр Папоў, Вадзім Сашурын... Увогуле, уся "залатая" каманда папярэдняга сусветнага першынства.

Нямала цікавага чакае і спартсменаў, якія спаборнічаюць пад "дахам". У гэтым жа месяцы ў Польшчы пройдзе еўрапейскае першынства па кулявой стральбе. А сярод нашых нямала снайпераў з сусветным імем. Сваю рэпутацыю гатовы пацвердзіць алімпійскія чэмпіёны Ірына Шылава, Сяргей Лукашык, "сярэбраны" алімпіец Атланты Ігар Басінскі. А калі размова зайшла аб алімпійцах, то нельга не ўспомніць барцоў-"класікаў", якія сустрэнуцца ў Фінляндыі на чэмпіянаце Еўропы ў маі. Дарэчы, іх галоўны трэнер Камандар Маджыдаў лічыць гэтыя турніры для сваіх падапечных "прапускным" балам у нацыянальную зборную, якая будзе прадстаўляць Беларусь на Алімпіядзе ў Сіднеі.

Сярод іншых спартыўных падзей года трэба адзначыць чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы (Грэцыя — жнівень), дзе беларускія "зоркі" спадзяюцца рэабілітавацца. А вось значны прагрэс у плаванні, які нашы спартсмены прадэманстравалі на чэмпіянаце Еўропы, яны гатовы пацвердзіць на сусветным першынстве ў Швецыі (красавік). Асабліва цікавым, вядома, будзе чэмпіянат свету па цяжкай атлетыцы ў Тайландзе (снежань), дзе нашых штангістаў прадставіць новы галоўны трэнер зборнай каманды рэспублікі двухразовы алімпійскі чэмпіён Аляксандр Курловіч. Зрэшты, не выключана, што ён і сам выйдзе на памост...

Вячаслаў ДУТАЎ.

Мы і свет

Хочаш вучыцца ў замежным каледжы? Бяры прыклад з Алены Новік

Тры гады назад вучаніца Беларускага гуманітарнага ліцэя Алена Новік стала пераможцай конкурсу, аб'яўленага Беларускім камітэтам каледжаў міжнароднай супольнасці і паехала вучыцца ў Італію. З таго часу яшчэ некалькі беларускіх старшакласнікаў атрымалі магчымасць вучыцца за мяжой.

Што гэта за адукацыйная сістэма — каледжы міжнароднай супольнасці? Якое месца ў ёй займае Беларусь? За адказам на дадзенае пытанне я звярнулася да старшыні Беларускага камітэта гэтай арганізацыі Уладзіміра КОЛАСА.

— Каледжы міжнароднай супольнасці — гэта адукацыйная арганізацыя, мэтай якой з'яўляецца ўсталяванне ідэалаў міру, супрацоўніцтва, талерантнасці паміж моладдзю розных краін праз адукацыю. Ідэя яе стварэння нарадзілася ў канцы 40-х гадоў у Германіі як альтэрнатыва таталітарнаму, фашысцкаму рэжыму.

Нас прываблівае ў сістэме міжнародных каледжаў менавіта тое, што яна не з'яўляецца нейкім сціраннем нацыянальных рыс і аб'яднаннем у адзіную сям'ю, а, наадварот, гэтая арганізацыя з вялікай увагай, пашанай і цікаўнасцю ставіцца да нацыянальных асаблівасцей і культуры кожнага народа. Адной з умоў пры адборы кандыдата з'яўляецца тое, ці можа вучань прадставіць сваю краіну, наколькі ён ведае яе гісторыю і культуру.

— Колькі каледжаў аб'ядноўвае гэтая міжнародная арганізацыя?

— Зараз ва ўсім свеце такіх каледжаў 10. Уэльскі — у Вялікабрытаніі, Адрыятычны — у Італіі, Паўночны каледж Чырвонага Крыжа — у Нарвегіі, два — у Паўночнай Амерыцы: адзін — у ЗША, другі — у Канадзе. Сельскагаспадарчы каледж імя Сымона Балівара знаходзіцца ў Венесуэле. Ёсць каледжы ў Ганконгу, Сінгапуры, не вельмі даўно адкрыўся ў Свазілендзе, побач з Паўднёвай Афрыкай, і зараз яшчэ адзін адкрываецца ў Індыі. Ва ўсім свеце існуе каля 150 нацыянальных камітэтаў, якія накіроўваюць у гэтыя каледжы студэнтаў.

— Уладзімір Георгіевіч, было б цікава даведацца, чым канкрэтна займаецца Беларускі камітэт? Наколькі я разумею, ваша арганізацыя зусім маладая, стварылася не так даўно.

— Так, мы існуем тры гады. Ініцыятыва стварэння нашага камітэта належыць старшыні Польскага камітэта, прафесару Паўлу Чартарыйскаму. Менавіта ён прапанаваў стварыць такую арганізацыю ў нас на Беларусі. Гэтую ідэю падтрымаў прафесар Адам Мальдзіс, і быў абраны нацыянальны камітэт, старшынёй якога я і стаў.

Мне як дырэктару Беларускага гуманітарнага ліцэя гэтая ідэя падалася вельмі цікавай. Мы займаемся распрацоўкай праекта рэформы нашай адукацыі, і нам вельмі цікава вывучаць дзейнасць такіх замежных адукацыйных структур.

— У каледжах займаюцца прадстаўнікі розных краін свету. На якой мове вядзецца навучанне?

— На англійскай. Акрамя таго, у вучняў ёсць магчымасць вывучаць родную мову. Беларуская мова таксама ўвайшла ў праграму міжнародных каледжаў. Першая наша прадстаўніца Алена Новік пакінула ў бібліятэцы італьянскага Адрыятычнага каледжа беларускія кнігі.

— Уладзімір Георгіевіч, раскажыце, калі ласка, падрабязней, як трапіла ў гэты каледж прадстаўніца нашай краіны?

— Калі Беларусь увайшла ў Міжнародную супольнасць каледжаў, нам было прапанавана адно месца ў Італіі. Камітэт абвясціў рэспубліканскі конкурс для вучняў старэйшых класаў, якім споўнілася 16 гадоў, пераможцам якога стала выхаванка Беларускага гуманітарнага ліцэя г.Мінска Алена Новік. Калі праз год я прыехаў у Італію, то чуў пра Алену самыя найлепшыя водгукі. У вялікім захапленні ад дзяўчыны быў выкладчык нямецкай мовы, вядомы аўстрыйскі паэт Ганс Раймунд.

— Хто цяпер з беларускіх хлопцаў і дзяўчат вучыцца ў такіх каледжах?

— Мы вельмі сур'ёзна падыходзім да адбору, імкнемся, каб па-сапраўднаму здольныя дзеці траплялі вучыцца ў гэтыя ўстановы. І, ведаеце, назіраецца пэўны прагрэс. Спачатку паехала адна Алена, заявіла аб сабе, і ўжо ў наступным годзе двое прадстаўнікоў Беларусі атрымалі магчымасць вучыцца ў каледжах. У мінулым годзе таксама паехалі двое вучняў, а зараз нам прапанавалі ўжо 5 месцаў. Каледжы Італіі, Нарвегіі, Індыі прадстаўляюць цалкам бясплатнае навучанне, а для каледжаў Афрыкі і Венесуэлы трэба знайсці сродкі на аплату 50 працэнтаў кошту. Мы шукаем грошы і ўжо аб'явілі конкурс: сачыненне на тэму: "Будучыня Беларусі ў свеце" на англійскай і беларускай мовах.

— І апошняя пытанне. Хто фінансуе гэтыя каледжы?

— Каледжы міжнароднай супольнасці — арганізацыя недзяржаўная. Фінансаванне вядзецца з тых крыніц, якім падабаецца такая сістэма адукацыі. Цэнтр яе знаходзіцца ў Лондане. Прыкметна тое, што старшынямі гэтай супольнасці заўсёды былі сусветна вядомыя і важныя асобы. 10 гадоў яе ўзначальваў прынц Уэльскі. Зараз старшынёй абрана каралева Іарданіі Нора.

Гутарыла Марыя ЭЙСМАНТ.

Точка зрения

Захват оппозицией законодательной власти и как с этим бороться

Валерий ЩУКИН, депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва

После ноябрьского референдума много говорят о победе президента. Победа — это полный успех в бою, на войне или в соревновании. Положение тех, кого победили, характеризуется одним словом — поражение. При этом сразу же возникает вопрос: кто же и с кем воевал или соревновался в 1996 году?

С одной стороны — исполнительная власть, руководимая главой государства, а с другой — белорусский народ и его представители в государстве - депутаты Верховного Совета. Назвать прошлогодние события соревнованием язык не поворачивается, поскольку спорт предполагает равные весовые категории, единые критерии к спортивным снарядам, оружию, поведению и наличие судьи, следящего за соблюдением противником правил игры.

То, что происходило в Беларуси, подпадает под страшный термин — война. С одной стороны, дисциплинированная, хорошо вооруженная в прямом и переносном смысле исполнительная вертикаль главы государства, оснащенная к тому же оружием массового нервно-паралитического поражения, коим являются средства массовой информации; с другой — не обладающий иммунитетом против поражающего воздействия средств массовой инфрмации, разобщенный по городам и весям белорусский народ. Да и моральные принципы у воюющих сторон качественно отличались. Если народ и его представительные органы строго соблюдали нормы политической борьбы, то исполнительная власть, как и любой агрессор, попирала как законы государства, так и международные правовые нормы. Одно только изгнание с поля сражения рефери — председателя Центризбиркома и его ассистентов — представителей и наблюдателей от Верховного Совета, политических партий, общественных организаций наглядно характеризует сущность осенних событий.

Положение усугублялось еще и тем, что исполнительная власть задолго до объявления народу войны внедрила своих людей в законодательный орган. Пятая колонна — фракция "Согласие" составила 30 процентов депутатского корпуса. Поэтому поражение народа было предопределено: нынешней исполнительной власти не нужна в государстве ни одна самостоятельная структура, тем более издающая обязательные для нее нормативные акты. Вопрос состоял только в том, сколько времени продержатся в Овальном зале народные представители.

Благодаря тому что председателем Верховного Совета стал С.Шарецкий, смогли проработать десять месяцев. Будь на этой должности кто-либо иной (В.Новиков, Г.Карпенко...) исполнительная власть разогнала бы законодательный орган уже через пару месяцев. Верховный Совет 13-го созыва и его Президиум практически во всем шли навстречу президенту, поскольку, как и перед Красной Армией в 1941 году, почти ежедневно вставала дилемма: или погибнуть, или в очередной раз отступить перед превосходящей в финансовом и информационном оснащении армией противника. Сил поставить президента на место не было, а московский вариант событий на Беларуси, учитывая то, что рвущийся к неограниченной власти глава государства перед кровопролитием не остановится, для народных избранников был неприемлем.

От судьбы, известное дело, не уйдешь. И потому преждевременной смерти, уготованной судьбой, не избежать никому. Однако конкретные сроки гибели зависят уже от самого субъекта. Лишь одним избранием Президиума по фракционному принципу Верховный Совет продлил срок своей деятельности. Отход от данного принципа — избрание двух членов Президиума персонально — расширял сферу воздействия исполнительной власти на высший представительный орган народа. И именно предательство "персонального члена" — В.Саковича, "народного" представителя от Городокского района — определило успех исполнительной власти на ул.К.Маркса, 40 в ноябре 1996 года. В жестокости и обещании щедрот вертикаль не стеснялась. И как в 1941 году среди народных защитников оказались и трусы, и предатели, и шкурники.

Но, несмотря на это, Верховный Совет 13-го созыва мог бы продержаться намного дольше. Мог бы, если бы фракционный принцип в своей деятельности довел до логического конца — формирования всего двух фракций. Большинство в две трети — позиция: коммунисты, аграрии, "Гражданское действие", социал-демократы, независимые и меньшинство в одну треть — оппозиция: пропрезидентское "Согласие". Это бы существенно меняло в пользу народа персональный состав руководства комиссий и результаты голосования по многим законопроектам. Да и сами законы были бы другими, ведь свои антинародные предложения, в том числе и кадровые, провести через законодательный орган глава государства не смог бы. Президентское "вето" стало бы преодолимо.

Увы... и "гражданам", и "эсдекам" очень уж хотелось почему-то самим именоваться оппозицией. Что ж, и антигитлеровская коалиция тоже не сразу образовалась, а второй фронт — лишь через три года. Не смог и Верховный Совет 13-го созыва преодолеть свои разногласия и только сейчас начинает создавать антитоталитарную коалицию. К тому же если непокоренные депутаты поймут, что для противодействия авторитарно-диктаторскому режиму нужна жесткая координация действий, т.е. дисциплина, то победа над ним возможна. Пока еще это поняли не все депутаты Верховного Совета 13-го созыва — законодательного органа, отметившего 9 января 1997 года первую годовщину своей деятельности.

Крымінал

Не газуй у гаражы...

Мёртвыя целы мужчыны і жанчыны знойдзены ў аўтамабілі "Аўдзі", які знаходзіўся ў зачыненым гаражы ў Пружанах. Абодва атруціліся выхлапнымі газамі ад уключанага рухавіка. Хутчэй за ўсё размова ідзе не аб забойстве, а аб элементарнай неасцярожнасці. Уключыўшы рухавік, каб сагрэцца, вадзіцель і яго пасажырка не заўважылі, як іх агарнуў смяротны сон.

У гэты ж дзень у Баранавічах пры падобных акалічнасцях загінулі вадзіцель "Жыгулёў" і яго малады спадарожнік.

Марыя МАЛІНОЎСКАЯ.

Б'юць браканьераў па кішэні...

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, сума ўрону, нанесенага ў мінулым годзе браканьерамі, якія бясчынствуюць на рэках і азёрах рэспублікі, склала каля 1 мільярда рублёў. Затрыманыя павінны былі заплаціць штрафу ўвогуле амаль на два мільярды рублёў, у іх канфіскавана звыш 11 тысяч адзінак забароненых прылад і прыстасаванняў для лоўлі і звыш сямі тон рыбы.

У пераліку асабліва злосных парушэнняў прыродаахоўных законаў — сотні фактаў. Скажам, жыхар пасёлка Нарач В. быў затрыманы з 20 кілаграмамі вугроў. Толькі ён, на думку спецыялістаў, нанёс прыродзе ўрон на 40 мільёнаў рублёў. Два браканьеры ў Докшыцкім раёне за выкарыстанне самаробных выбуховых прыстасаванняў пры лоўлі рыбы былі асуджаны на два гады пазбаўлення волі. Да аднаго года папраўча-працоўных работ прыгавораны два браканьеры з Пінскага раёна.

Таццяна СМІРНОВА.

Наболело!

"Тихая" месть директора школы может довести нас до гробовой доски

Дорогая редакция!

Мы, учителя средней школы N 8 г.Речицы, супруги Барановские, доводим до вашего сведения следующий факт. Со времени аварии на Чернобыльской атомной стации в нашей школе проводится вывоз детей на оздоровление совместно с учителями. Но с тех пор, как директором стала Т.В.Филиппова (а это уже десять лет), мы лично никуда не выезжали с детьми, хотя проработали в системе народного образования 35—40 лет. Относились и относимся к делу честно, добросовестно, готовим к соревнованиям неплохие команды. Десять лет подряд наша школа занимала первое место в городе по "Стартам надежд", и кубок остался в нашей школе навечно.

Обращались в район по поводу неправильной организации вывоза детей, имея в виду, что наши спортсмены не попадают в число отъезжающих, хотя отдают немало сил, защищая спортивную честь школы. После вмешательства Комитета по чернобыльским делам наши замечания учли, спортсменов стали посылать, учителей — по третьему кругу, но только не нас. "Тихая" месть директора приобрела изощренную форму: она посылала на оздоровление даже секретаря, которая только пришла на работу (в г.Севастополь), посылала библиотекаря, только нас обходила стороной, учителей с многолетним опытом. Кандидатуры нигде не обсуждались, все делалось "втихую" в кабинете директора.

Речь идет не просто об отношении к нам со стороны руководства школы, а об ущемлении наших гражданских прав, о самой настоящей мести. В личной беседе директор однажды прямо заявила: "Не надейтесь и не ждите". И это за то, что пожаловались, хотя мы защищали в первую очередь права спортсменов, а потом уже свои.

